# Асэнсоўваючы рэчаіснасць

## Развагі напярэдадні XXV з’езда Саюза пісьменнікаў Беларусі

Спачатку было слова… Гэты фрагмент біблейскага сцвярджэння знаёмы кожнаму, хто лічыць сябе адукаванай асобай. Для журналістаў, пісьменнікаў, увогуле ўсіх, хто са словам працуе, гэта, на мой погляд, аксіёма прафесійнай дзейнасці.

Больш за тое, мне імпануе наступная думка: нават усё нерэальнае, прыдуманае, атрымаўшы назву, сваё «слова», ужо як бы існуе насамрэч. Напэўна, так у літаратуры развіўся жанр сучаснага фэнтэзі. «Фантастыка мяркуе наяўнасць неверагоднага, казачнага дапушчэння ў якасці асноватворнай сюжэтнай лініі», – гаворыць намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік секцыі прыгодніцкай і дэтэктыўнай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Мацвіенка. Яно так – цяжка не пагадзіцца з вядомым айчынным фантастам, але…

Але жывём мы ў рэальным свеце, дзе з зайздросным пастаянствам перад асобай узнікае шмат хвалюючых пытанняў. Знайсці адказы на іх ці хаця б дапамагчы намацаць патрэбны шлях чалавеку заўсёды дапамагала літаратура. Нават фантастычная, не кажучы ўжо пра рэалістычны яе напрамак.

***«Веданне роднай мовы, паважлівае стаўленне да нашых традыцый і культуры павінна быць абавязковым для грамадзян краіны».***

А што мы маем сёння? Пэўная частка грамадства шчыра перакanана ў адсутнасці хоць нейкага літаратурнага працэсу ў Беларусі. Ігар Арловіч у сваіх «нарысах» увогуле настойвае, што сучаснаму чытачу

**На XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы падчас круглага стала «Кніга і слова. Погляд у будучыню» разглядаліся праблемы кнігавыдання і айчыннай літаратуры. Люты 2021 года**



«беларуская літаратура не цікавая» і, як ён мяркуе, існуюць два «паралельныя светы» – літаратура на беларускай мове і на рускай. Прычым «мясцовай літаратуры на рускай мове і не існуе». На думку «нарысіста», найбольш яркія аўтары папросту сыходзяць на неабсяжны расійскі рынак. «Так Беларусь сама выпіхвае з сябе таленавітых рускамоўных аўтараў», – рэзюмуе ён.


Міхась Башлакоў

– Ёсць беларуская літаратура менавіта на беларускай мове і ёсць рускамоўная літаратура Беларусі, – расстаўляе кропкі над «і» лаўрэат Дзяржаўнай прэміі паэт Міхась Башлакоў. – Сапраўдны беларус – ён сапраўдны ў душы. Людзі, што тут жывуць і пішуць па-руску, далёкія ад стылю і мовы Тургенева, Талстога. Беларускасць сядзіць у іх вельмі глыбока. Праяўляецца гэта перш за ўсё ў павазе да сваёй краіны.

Дзе сапраўды балючая сітуацыя, дык у выкарыстанні беларускай мовы, лічыць творца. Выратуе нас дзяржаўная праграма па адраджэнні і захаванні ў грамадстве беларускасці, упэўнены ён.

– Незалежнай дзяржавы без нацыянальнай ідэі не бывае, – разважае Міхась Башлакоў. – Не кажу пра тое, што мы павінны адгарадзіцца ад усіх і ўсяго, спавядаць толькі беларускае. Калі ласка, гаварыце і пішыце хоць на усіх мовах свету… Але веданне роднай, паважлівае стаўленне да нашых традыцый і культуры павінна быць абавязковым для грамадзян краіны.

Міхась Башлакоў лічыць, што мастацкая літаратура заўсёды была на перадавых пазіцыях – яна выхоўвала патрыятызм, фарміравала ў чалавеку найлепшыя рысы і якасці, усталёўвала ў грамадстве пэўныя нормы маралі, якія не дазвалялі чалавеку дэградаваць як асобе. Бо ўсёдазволенасць разбурае чалавека, раўнуе яго душу.

На яго думку, усё «адразу абрынулася і пакацілася ў нейкую бездань, ва ўсіх сферах пачало буйна цвісці пустазелле бездухоўнасці» пасля таго, як у школе значна паменшылі колькасць гадзін на вывучэнне беларускай і рускай літаратур і адмянілі пісьмовыя і вусныя экзамены па літаратуры.

– Духоўнасць нараджаецца літаратурай, а яна амаль на задворках грамадскага жыцця, – з горыччу канстатуе вядомы паэт. – Вельмі сумна і крыўдна. Калі мы хочам будаваць дзяржаву, выхоўваць патрыятызм, дык давайце ж падымаць мастацкае слова, літаратуру!

Заклапочанасць Міхася Башлакова падзяляюць і іншыя літаратары. Але пры гэтым звяртаюць увагу, што ў параўнанні з савецкім часам у суверэннай Беларусі прыкметна змяніліся сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця. Гэта заўважна адбілася і на літаратурным працэсе. Можна сказаць, што беларуская літаратура сёння ўсё яшчэ ў пошуку «новай асобы». Асаблівыя надзеі творцы ўскладаюць на маючы адбыцца XXV з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі, які, на іх думку, мусіць даць адказы на шматлікія пытанні, як далей будзе развівацца літаратурная справа ў краіне.

***«...Саюз пісьменнікаў як творчая арганізацыя павінен быць не проста супольнасцю, якая аб'ядноўвае ўсіх, хто піша і выдаецца, а мудрым генератарам новых творчых ідэй у літаратуры».***


Уладзімір Гаўрыловіч

Старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» заслужаны дзеяч культуры Уладзімір Гаўрыловіч спадзяецца на шчырыя дыялог.

– Галоўная для творцаў праблема – прафесіяналізм, якасны ўзровень сучаснай мастацкай літаратуры, адлюстраванне складаных тэм, якія спараджае жыццё, – гаворыць ён. – А Саюз пісьменнікаў як творчая арганізацыя павінен быць не проста супольнасцю, якая аб'ядноўвае ўсіх, хто піша і выдаецца, а мудрым генератарам новых творчых ідэй у літаратуры.

Кіраўнік рэгіянальнага аддзялення пісьменніцкага саюза чакае, што на творчым форуме размова найперш пойдзе пра ролю літаратара ў грамадстве. Варта, на яго думку, засяродзіцца на статусе пісьменніка – ён мае быць важкім, значным і ў маральным, і ў матэрыяльным сэнсе. Інакш прафесійная творчасць усё больш будзе нагадваць самадзейную, што дапусціць нельга.

Як падтрымаць таленавітую творчую моладзь, дапамагчы ёй «прабіцца» – яшчэ адна пільная задача, над якой трэба сур'ёзна паразважаць на форуме.

Сёння пісьменнік – гэта перш за ўсё патрыёт, чые грамадзянская і творчая пазіцыі непадзельныя з лёсам краіны і народа, пераканаены Уладзімір Гаўрыловіч.

– У мяне часта пытаюцца: хто ён, сучасны герой мастацкага твора? – гаворыць пісьменнік. – Адказваю так, як думаю: гэта просты, звычайны чалавек, які любіць сваю



Дзень беларускага пісьменства – гэта заўсёды свята! Мінская вобласць, г. Капыль. Верасень 2021 года

зямлю, працуе на ёй, дбае пра Радзіму і род свой, годна рэагуе на праблемы, з якімі сустракаецца на дарозе жыцця. Няважна, якой прафесіі і заняткаў герой. Галоўнае, каб яго паводзіны ў мастацкім творы вучылі дабрыні, сардэчнасці, любові адно да аднаго і веры – усяму таму, што вызначае Чалавечнасць.

***«На дзіцячую літаратуру мае сэнс выдаткоўваць максімум рэсурсаў, гэта інвестыцыі ў будучыню нацыі».***

Час для сур'ёзнай, прынцыповай размовы ў пісьменніцкім асяроддзі сапраўды наспеў. Хапае і так званых унутрысаюзных праблем. Клапоціць узровень прафесійнага майстэрства тых, хто жадае стаць сябрам Саюза пісьменнікаў. У мінскім абласным аддзяленні лічаць, што кандыдаты павінны праходзіць выпрабавальны тэрмін. Трэба нарэшце разабрацца з ганарарнай сістэмай аплаты працы, выданнем і продажам кніг праз сістэму кніжнага гандлю… Як кажуць – тое, што набалела. Але галоўнае, вядома ж, творчасць, пошук сучаснага героя і тых пластоў грамадскага жыцця, што павінны найперш варушыць у сваіх творах пісьменнікі.



Кацярына Хадасевіч-Лісавая

Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі 2020 года ў намінацыі «Дзіцячая і падлеткавая літаратура» Кацярына Хадасевіч-Лісавая лічыць вельмі важным кірункам дзіцячую літаратуру. Паводле слоў пісьменніцы, сёння назіраецца яе росквіт. Трэба пастарацца, каб кожная выдадзеная кніга знайшла сваю аўдыторыю – гэта супольная праца пісьменнікаў, выдавецтваў, бібліятэк, школ, бацькоў, сродкаў масавай інфармацыі, упэўнена Кацярына.

– Было б цудоўна паводле кніг стварыць мультфільмы, зняць казкі, выкарыстоўваць сюжэты і цікавых персанажаў у «Калыханцы» напрыклад, – марыць пісьменніца. – Хацелася б бачыць рэкламу дзіцячых кніг на тэлебачанні, любавацца тэматычнымі банерамі на вуліцах, чытаць пра новыя выданні на яркіх лістоўках у вагонах метро. Запускаць буктрэйлеры на разнастайных экранах, у інтэрнэце. А яшчэ персанажам беларускіх казак добра было б з'явіцца на дзіцячым адзенні, заплечніках,

пеналах… Менавіта на дзіцячую літаратуру мае сэнс выдаткоўваць максімум рэсурсаў, гэта інвестыцыі ў будучыню нацыі.

Літаратары Міншчыны аб’ядналіся ў творчую суполку ў 2006 годзе дзякуючы актыўнай пазіцыі Рыгора Сакалоўскага, вядомага паэта, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, які, на жаль, пайшоў з жыцця.

– Сёння пісьменнікі сталічнай вобласці, а іх крыху больш як 80 чалавек, пішуць прозу, песні, вершы для дарослых і дзяцей, займаюцца перакладамі на беларускую мову твораў літаратараў іншых краін, – расказвае Святлана Быкава, старшыня аддзялення, паэтэса і перакладчыца. – Творчасць многіх з іх шырока вядома, а Наталля Голубева, Зіновій Прыгодзіч, Сяргей Клімковіч, Кацярына Хадасевіч-Лісавая і Алесь Карлюкевіч сталі лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі.

За апошнія пяць гадоў літаратары Міншчыны выпусцілі пад тры сотні кніжак. Сама Святлана Быкава актыўна друкуецца не толькі на радзіме, але і за мяжою – у Расіі, Сербіі, Узбекістане, Албаніі. У родным Заслаўі яна вядзе вялікую працу з дзецьмі: ужо пабачылі свет тры агульнагарадскія зборнікі літаратурнай і выяўленчай творчасці юных заслаўчан. У кастрычніку 2021 года за дасягненні ў галіне літаратуры і актыўную культурна-асветніцкую дзейнасць паэтэсу ўзнагародзілі медалём Францыска Скарыны.

Наўрад ці можна пагадзіцца са скептыкамі, якія прадказваюць беларускай літаратуры сумную будучыню, выключна змрочнымі фарбамі малююць яе сённяшні дзень.

Зразумела, гэта не так. Але відавочна, што ў пісьменніцкім цэху даўно трэба прынцыпова пагаварыць пра стан спраў, вызначыць сваё месца ў жыцці краіны. Каб быць сугучнымі часу, патрэбнымі людзям…

***Леанід КРЫВАНОС***

***Фота БЕЛТА і з адкрытых крыніц***

Беларуская думка

**Падпісацца на часопіс «Беларуская думка» ніколі не позна!**

**74938** ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПАДПІСКА

Кошт: 1 мес. – 4,31 руб., 3 мес. – 12,93 руб., 6 мес. – 25,86 руб.

**749382** ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА

Кошт: 1 мес. – 12,33 руб., 3 мес. – 36,99 руб., 6 мес. – 73,98 руб. (уключаючы падатак на дабаўленую вартасць)

**Часопіс па падпісцы абыдзецца танней, чым набываць яго ў розніцу!**